**СКЛАДАНАЗАЛЕЖНЫ СКАЗ**, складаная сінтаксічная адзінка, часткі якой звязаны падпарадкавальнай сувяззю. Падпарадкаванне – гэта нераўнапраўныя залежныя адносіны паміж словамі або прэдыкатыўнымі часткамі ў складаным сказе. У межах складаназалежнага сказа вылучаюцца часткі, адна з якіх лічыцца сінтаксічна галоўнай, а даданая (залежная) развівае, пашырае, удакладняе змест галоўнай. Сінтаксічная залежнасць частак праяўляецца ў пастаноўцы пытання ад галоўнай часткі да даданай. Самым выразным фармальным паказчыкам падпарадкавальнай сувязі выступаюць злучнікі і злучальныя словы, якія знаходзяцца ў даданай частцы: *У кожнага быць павінна свая баравіна, дзе трымаюць на зялёных руках сосны самае зыркае сонца* (П. Панчанка); *Гляджу на ліпень і дзіўлюся, што шчасце ў годах не тане* (А. Астрэйка). З сэнсавага боку найбольш значная інфармацыя можа быць змешчана і ў даданай частцы.

Даданыя часткі складаназалежнага сказа могуць залежаць непасрэдна ад пэўнага члена галоўнай часткі, ад прэдыкатыўнага словазлучэння галоўнай часткі ці ад усёй галоўнай: *Даруй за сонечнае лета, што хуткай птушкай праплыло, за наш світанак не сустрэты* (М. Шабовіч); *І кожны з нас успомніць, як пярун страшэнны грымнуў на Кацярынінскі бальшак з бярозамі старымі* (П. Панчанка); *Каб гаварыць з зямлёй, я вучыўся ў касы і плуга* (М. Танк). У такім выпадку падпарадкавальная сувязь паміж галоўнай і даданай часткамі мае падабенства да сувязі паміж галоўным і даданым членамі сказа. Даданую частку можна трансфармаваць у даданы член сказа: *Не забуду ў аўтобусным груку, што мне ўслед твае вочы сказалі* (М. Шабовіч) і *Не забуду ў аўтобусным груку тваіх вачэй.*

Даданая частка можа залежаць і ад указальнага (суадноснага) слова (т. зв. карэлята), якое знаходзіцца ў галоўнай частцы. Гэта слова ў галоўнай частцы выконвае тую самую сінтаксічную функцыю, што і даданая частка сказа. У гэтым выпадку даданая частка раскрывае змест у значнай ступені асемантызаванага ўказальнага слова. Карэлят служыць для сувязі галоўнай і даданай частак і абумоўлівае характар адносін паміж імі: *У розныя бакі краіны той, дзе вечныя іх сховы, раз'ехаліся моўчкі дружбакі* (А. Куляшоў); *Я шчыра ганаруся тым, што родам сам з-пад Капыля* (А. Астрэйка); *Калі вяртаецца нядзеля, тады збываецца надзея* (М. Шабовіч); *Так узяло старога за душу, што ён і назаўтра і напаслязаўтра прыходзіў на выстаўку* (Б. Сачанка).

У залежнасці ад характару сувязі і семантыка-сінтаксічных адносін даданая частка можа размяшчацца ў прэ-, інтэр- і постпазіцыі адносна галоўнай: *Каб патрапіць у глыбіню, я набіраю паветра ў грудзі і бяру ў рукі камень* (А. Разанаў); *Штогод, перш чым запаліць кастры на бярозах ці асінах, восень упрыгожвае пушчу дыванамі верасоў* (Я. Пархута); *І ... так вабіла чыстая, наскрозь празрыстая сінеча далечы, што міжволі сціналася, замірала ад захаплення сэрца* (Т. Бондар).

Даданая частка складаназалежнага сказа можа падпарадкоўвацца не толькі галоўнай, але і другой даданай гэтага сказа: *Я прыглядаўся да горада і з нейкай радасцю адзначаў сабе, што ён не такі, які здаваўся мне, калі я*

РЭПОЗІТОРЫЙ БДПУ

*ўбачыў яго ўпершыню* (М. Стральцоў) (гл. **СКЛАДАНАЗАЛЕЖНЫ СКАЗ З НЕКАЛЬКІМІ ДАДАНЫМІ ЧАСТКАМІ**). Складаназалежныя сказы заўсёды маюць закрытую структуру.

Прэдыкатыўныя часткі ў межах складаназалежнага сказа, як і часткі складаназлучанага сказа, могуць мець розную будову (быць аднасастаўнымі і двухсастаўнымі, развітымі і неразвітымі, ускладненымі і няўскладненымі, поўнымі і няпоўнымі): *У зязюлі мне пытацца сорам, колькі год яшчэ я пражыву…* (П. Панчанка); *Бачыў шмат я гарачых вачэй, што за ясныя зоры ярчэй* (А. Астрэйка); *Бег* [Трахім], *аж вецер свістаў увушшу* (Б. Сачанка); *Паветра сокам пахла і вясною, калі рака змывала берагі* (М. Шабовіч).

Асноўнымі сродкамі сувязі частак ў складаназалежным сказе выступаюць падпарадкавальныя злучнікі і злучальныя словы. Падпарадкавальныя злучнікі выражаюць паміж часткамі складаназалежнага сказа розныя семантыка-сінтаксічныя адносіны і ў адпаведнасці з характарам гэтых адносін яны падзяляюцца на *часавыя* (*калі*, *пакуль*, *як*, *ледзь*, *чуць*, *толькі*, *як толькі*, *тым часам як*, *з таго часу як*, *пасля таго* як, *перш чым* і інш.), *прычынныя* (*бо*, *што*, *таму што*, *паколькі*, *з прычыны таго што*, *як* і інш.), *мэтавыя* (*каб*, *для таго каб*, *дзеля таго каб*, *з тым каб*, *абы* і інш.), *умоўныя* (*калі*, *калі б*, *каб*, *як*, *раз*, *абы* і інш.), *параўнальныя* (*як*, *нібы*, *быццам*, *што*, *бы* і інш.), *уступальныя* (*хоць*, *няхай* (*хай*), *нягледзячы на тое што* і інш.), *тлумачальныя* (*што*, *як*, *каб*, *чым*, *нібы* і інш.), *выніковыя* (*так што*, *то*, *дык*). У функцыі злучальных слоў у складаназалежных сказах выступаюць адносныя займеннікі *хто*, *што*, *які*, *каторы*, *чый* і прыслоўі *дзе*, *куды*, *адкуль*, *калі*, *як*, *пакуль* і інш.

Крытэрыі размежавання злучнікаў і злучальных слоў складаназалежнага сказа наступныя:

1) злучальныя словы не толькі звязваюць даданыя часткі, але і выконваюць ролю члена сказа ў даданай частцы, таму іх нельга апусціць або замяніць на сінанімічныя злучнікі;

2) лагічны націск маюць толькі злучальныя словы, паколькі гэта самастойныя часціны мовы (займеннікі і прыслоўі);

3) адзінкі *адкуль*, *дзе*, *куды*, *колькі*, *наколькі*, *які*, *хто*, *чаго* (*адчаго*), *чаму*, *чый*, *каторы* ў сказе заўсёды з'яўляюцца злучальнымі словамі;

4) адзінкі *бо*, *каб*, *няхай* (*хай*), *пакуль*, *раз*, *чым – тым* і інш. у сказё заўсёды з'яўляюцца злучнікамі.

Дадатковымі сродкамі сувязі ў складаназалежных сказах з'яўляюцца таксама інтанацыя, парадак размяшчэння частак, суадносіны трывальна-часавых форм дзеясловаў-выказнікаў і іншыя лексіка-граматычныя адзінкі.

Агульнапрынятай класіфікацыі даданых частак складаназалежнага сказа ў лінгваметадычнай літаратуры на сёння не існуе, паколькі яна праводзіцца па розных крытэрыях. Прыхільнікі фармальна-граматычнай класіфікацыі падзяляюць даданыя часткі ў залежнасці ад сродкаў сувязі з галоўнай (А.М. Пяшкоўскі і інш.). Паводле гэтай класіфікацыі вылучаюцца два тыпы складаназалежных сказаў: са злучнікавымі словамі (адноснае прадпарадкаванне) і злучнікамі (злучнікавае падпарадкаванне). Недахоп

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

фармальна-граматычнай класіфікацыі, на думку некаторых даследчыкаў (напрыклад, В.І. Рагаўцова), заключаецца ў тым, што яна падмяняецца класіфікацыяй сродкаў сувязі.

Функцыянальна-семантычная класіфікацыя ўлічвае сінтаксічную функцыю даданай часткі ў адносінах да галоўнай. Паводле гэтай класіфікацыі даданыя часткі падзяляюцца ў залежнасці ад той сінтаксічнай функцыі, якую яны выконваюць адносна галоўнай (на такія тыпы, як члены сказа) – на даданыя дзейнікавыя, выказнікавыя, азначальныя, дапаўняльныя і інш. Такая тыпалогія выкарыстана ў вучэбна-метадычным дапожніку М.С. Яўневіча, П.У. Сцяцко (2006), у большасці школьных падручнікаў па беларускай мове, паколькі з'яўляецца вельмі зручнай і зразумелай для навучання. Аднак дадзеная класіфікацыя лічыцца супярэчлівай, паколькі даданыя часткі і члены сказа не заўсёды функцыянальна суадносяцца, некаторыя тыпы даданых частак (параўнальныя, супастаўляльныя, далучальныя, выніковыя) не адпавядаюць ніякім членам сказа, таму што вылучаюцца ўжо зусім на іншай аснове.

Структурна-семантычная класіфікацыя ўлічвае і характар адносін паміж прэдыкатыўнымі часткамі, і асаблівасці іх структуры. Паводле гэтай класіфікацыі адрозніваюць складаназалежныя сказы нерасчлянёнай будовы і складаназалежныя сказы расчлянёнай будовы (К.У. Скурат, Л.І. Бурак, Т.Р. Рамза). **Складаназалежныя сказы нерасчлянёнай будовы** – разнавіднасць складаназалежных сказаў, у якіх даданыя часткі прымацаваны да галоўнай цеснай сувяззю, паколькі адносяцца да асобных яе кампанентаў і служаць для іх канкрэтызацыі і ўдакладнення. Паміж часткамі складаназалежнага сказа нерасчлянёнай будовы выражаюцца суб'ектныя, прэдыкатыўныя (ці працэсуальныя), аб'ектныя, атрыбутыўныя адносіны, адносіны спосабу дзеяння, а таксама адносіны меры і ступені. **Складаназалежныя сказы расчлянёнай будовы** – разнавіднасць складаназалежных сказаў, у якіх даданыя часткі прымацаваны да галоўнай слабай сувяззю, паколькі адносяцца да ўсяго яе зместу і не прадвызначаны структурай. Паміж часткамі складаназалежнага сказ расчлянёнай будовы выражаюцца часавыя, прасторавыя, прычынныя, мэтавыя, умоўныя, уступальныя, параўнальныя, далучальныя, супастаўляльныя адносіны і адносіны выніку (гл. **ТЫПЫ СКЛАДАНАЗАЛЕЖНАГА СКАЗА**).

Складаназалежныя сказы нерасчлянёнай будовы носяць яшчэ назву прыслоўныя складаназалежныя сказы, а расчлянёнай – прыфразныя (І.Л. Бурак). Да прыслоўных адносяцца складаназалежныя сказы з даданымі дзейнікавымі, выказнікавымі, азначальнымі, дапаўняльнымі часткамі, часткамі спосабу дзеяння, меры і ступені, а таксама з даданымі часткамі месца (выкарыстоўваецца традыцыйная тэрміналогія). Да прыфразных належаць сказы з даданымі часткамі часу, прычыны, мэты, умовы, уступкі, выніку, параўнальнымі і далучальнымі (І.Л. Бурак). Некаторыя даследчыкі (П.У. Сцяцко) адрозніваюць яшчэ, акрамя названых, і складаназалежныя сказы з даданымі супастастаўляльнымі часткамі.

*С.С.Мароз*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ